**ЛІТАРАТУРА**

1. Крапіва, К. Беларускія прыказкі / К. Крапіва // Збор твораў у пяці тамах. Т. 5. Нарысы, артыкулы, пераклады. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – 447 с.
2. Лепешаў, І. Я. Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Мінск: Бел. асац. "Конкурс", 2006. – 544 с.
3. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кнігах / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.; кн. 2. – 616 с.
4. Янкоўскі, Ф. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Ф. Янкоўскі. – 3-е выд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.

УДК 821.161.3.09

## ПУБЛІЦЫСТЫКА Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ У. КАРАТКЕВІЧА

**Банцэвіч П. К.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Публіцыстыка – від літаратуры, прысвечаны грамадскім праблемам, актуальным для сучаснасці і будучыні. Ад навуковага твора публіцыстычны адрозніваецца дапушчальнасцю пэўнай суб'ектыўнай ацэнкі з'яў і імкненнем да высноў на будучыню. Мэта публіцыстыкі – змена грамадскай свядомасці [1].

У. Караткевіч пакінуў адметны след у беларускай публіцыстыцы. Публіцыстычныя творы пісьменніка былі апублікаваныя ў газетах «Літаратура і мастацтва», «Гродненская правда», «Знамя юности», «Литературная газета», «Звязда», «Чырвоная змена», у часопісах «Беларусь», «Новый мир», «Маладосць», «Полымя», «Неман», «Молодая гвардия» і інш. На сённяшні дзень вядома 95 публіцыстычных твораў У. Караткевіча, якія склалі аснову 8-га тому Збора твораў [3]. У спадчыне мастака многія публіцыстычныя жанры – артыкулы, нарысы, эсэ, нататкі, рэцэнзіі, прамовы, літаратурная, тэатральная і мастацкая крытыка, агляд друку і інш. Тэматыка самая разнастайная, але нязменным застаецца актыўны патрыятызм, гуманізм, глыбокае ўсведамленне нацыянальных прыярытэтаў у агульна-супольным чалавечым быцці, шанаванне і абарона сваёй культуры, публічна-дэманстратыўнае зацвярджэнне нвцыянальна-культурных беларускіх каштоўнасцей.

У. Караткевіч быў перакананы, што пісьменнік – гэта выхавальнік грамадства, які павінен выконваць чарнавую работу: вучыць, пераконваць, раіць. Яго нарысы, эсэ – гэта пранікнёныя словы мудрага настаўніка, які цярпліва выкладае чытачам грунтоўныя ісціны.

У публіцыстычнай стылістыцы У. Караткевіча сінтэзаваліся праблемная напружанасць, аналітычная глыбіня зместу, рамантычна-узвышанае выяўленне складаных сацыякультурных працэсаў,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

тэмпераментныя, клічна-прамоўніцкія звароты, вострая дыялагічнасць, грамадзянская страснасць, шматлікасць спосабаў уздзеяння на чытача з мэтай пераканаць яго, усхваляваць і схіліць на свой бок: «Падумайце. Падумайце тысячу разоў. На тое вы – людзі, якія жывуць не адно сённяшняй хвілінай, а там хаця і трава не расці. Падумайце аб тым, што знікае ў нябыт, і аб тым, што ёсць і што будзе. Падумайце аб душы народа» [4].

Сярод эсэ пісьменніка найбольшую колькасць складаюць эсэ-прысвячэнні. Яны – пра канкрэтных людзей, пакінуўшых значны след ў айчыннай і сусветнай культуры. Жаданне даць свайму народу асвету вядзе па крутых шляхах Е. Полацкую і Ф. Скарыну, абуджае гістарычнае мышленне і гонар М. Багдановіч, у бясконцых вандроўках па нашай зямлі У. Калеснік. З шчырым захапленнем разважае пісьменнік пра беларускага песняра Я. Купалу, кампазітараў М. Агінскага і Р. Шырму, украінскіх класікаў Т. Шаўчэнку і Л. Украінку. Падкрэсліваючы вартасць зробленага тым ці іншым мастаком, У. Караткевіч вылучае іх непарыўную сувязь з народам, з грамадзянскім жыццём, «бо няма вялікіх і малых працаўнікоў у чалавецтва, бо кожны, хто шчыра служыць яму і прыносіць яму карысць заслугоўвае нашу павагу і памяць» [4].

У. Караткевіч аб’ездзіў шмат мясцін, лічыў лепшым адпачынкам вандроўкі ў далекія куткі, пазнаючы людзей і свет. Кожная паездка – гэта новы цыкл нарысаў, эсэ пра край, людзей, праблемы, заўважаныя з вострай цікавасцю даследчыка [5]. Нататкі з паездак па розных краінах, як гэта не дзіўна, цікавыя і буларусазнаўчым зместам: «Здалёку я асабліва палюбіў Беларусь, яе людзей» [4]. Распавядаючы пра розныя мясціны і народы, аўтар шукае там беларушчыну, робіць адпаведныя аналогіі, праводзіць паралелі, разважае, ацэньвае і такім чынам змушае і чытача шукаць, думаць.

Адной з важнейшых творчых задач пісьменнік лічыў папулярызацыю дасягненняў сусветнай літаратуры сярод беларускіх чытачоў, бо праз вывучэнне моў і літаратур свету асоба набывае магчымасць далучыцца да іншых культур, менталітэтаў [2]. У. Караткевіч мабілізаваў беларускіх літаратараў на пераклады сусветна вядомых твораў, еўрапейскай класікі, каб паказаць, што і па-беларуску можна вытанчана і высокім стылем выказваць складаныя пачуцці і рэфлексіі: «Нам патрэбны беларускі Дантэ, беларускі Гётэ. Без «Фаўста» і «Боскай камедыі» не можа абыходзіцца нічыя літаратура. Трэба гэта зрабіць для сябе, для ўзбагачэння сваёй мовы, для яе гнуткасці, шматфарбнасці, зіхацення, светаноснасці» [4].

У. Караткевіч выказвае занепакоенасць сучасным станам беларускай мовы, абураецца, што вучоныя «не ўдасужыліся за сто год даследаванняў зрабіць адносна поўны слоўнік старабеларускай мовы»



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

[4]. У артыкуле «Мова (што я думаю пра цябе)» творца вызначае асноўныя шляхі адраджэння беларускай мовы, пераконвае ў прынцыповай неабходнасці мець нацыянальную адукацыю і даваць моладзі магчымасць вучыцца на сваёй мове, успрымаць шырокі свет праз прызму свайго нацыянальнага менталітэту.

Публіцыстыка У. Караткевіча насычана маральнай праблематыкай праз даследаванне такіх яе значных аспектаў, як мараль і чалавек ва ўмовах НТП, мараль і барацьба за захаванне свету ад ядзернай катастрофы, чалавек – мараль – экалогія.

Актыўная праца У. Караткевіча на ніве публіцыстыкі дэтэрмінуецца жаданнем даць грамадзянскі ўрок сучаснікам, выпрацаваць грамадскую думку, дасягнуць павышэння інтэлектуальнага ўзроўню грамадства, як мага больш распавядаць пра родны край і яго знакамітых людзей, пра трагічныя і гераічныя старонкі гісторыі, далучаць чытачоў да скарбаў айчыннай і сусветнай культуры, выхоўваць нацыянальна-культурную ідэнтычнасць.

Дзейнасць У. Караткевіча вырашала задачы як тэарэтычна-канцэптуальнага, так і канкрэтна-практычнага характару. У большасці публіцыстычных твораў пісьменніка ўздымаецца праблема сутнасці культуратворчай працы на карысць нацыянальнай культуры.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 13: Праміле – Рэлаксін / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2001. – 576 с.
2.Верабей, А. Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча / А. Верабей. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 255 с.
3. Жаўняровіч, П. П. Публіцыстычны дыскурс Уладзіміра Караткевіча / П. П. Жаўняровіч. – Мінск: РІВШ, 2011. – 244 с.
4. Караткевіч, У. Збор твораў у 8 т. Т.8. Кн. 2. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 495 с.
5. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 229 с.

УДК 101.1:316

## ЕВРОПОЦЕНТРИЗМ И «КОЛОНИАЛЬНЫЙ МЕНТАЛИТЕТ»

**Бусько И. В.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

В условиях современной динамики геополитических процессов возникают сложные вопросы о будущем устройстве мира. Как утверждает большинство исследователей, мир движется от недолговременного момента однополярности последних десятилетий, когда ключевую роль на планете играла Западная цивилизация, или Глобальный Север, во главе с



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ